**Литература**

1 Воробьёв, В. В. Значения слов в разных языках и способы их семантизации / В. В. Воробьёв [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://schoolsrus.ru/m-k/stati/73-vorobiev. – Дата доступа: 10.03.2016

2 Туркменские сказки об Ярты-гулоке / отв. ред. Р. И. Филиппова. – Ленинград : Детгиз. – 132 с.

***А. В. Рудніцкая***
*Навук. кір.* ***А. У. Андрэева,***
*асістэнт*

## ФЕНОМЕН ТРАНСГУМАНІЗМУ Ў ЗБОРНІКУ ЮРАСЯ БАРЫСЕВІЧА “ALTER NEMO”

“Чалавек – адзіная істота, якая не ведае, ці сапраўды жыве ў свой час і ў сваім целе” [1]. Так пачаў Юрась Барысевіч сваю кнігу “лірычна-метафізычных тэкстаў, аб’яднаных пошукам межаў чалавечага існавання” [1]. Аўтар называе наш час эпохай канвеераў, а людзей “здрабнелымі” эгаістычнымі гуманоідамі, якія ўжо не здатны марыць, фантазіраваць, дбаць пра светлую будучыню ўсяго чалавецтва. Савецкага чалавека Юрась Барысевіч называе першабытным, а асобу сённяшняга часу – спажывецкім ротам грамадства.

“Alter Nemo” – зменены персанаж аўтара-фантаста раманаў Жуля Верна, а пануючай канцэпцыяй кнігі становіцца філасофія трансгуманізму, якая кажа: смяротнасць чалавека – гэта не праблема, а задача. Юрась Барысевіч сцвярджае, што грамадства набірае абароты, у той час як сама эпоха мадэрну знаходзіцца на апошнім дыханні.

У кнігу ўключаны эсэ, што асвятляюць розныя аспекты трансгуманізму ў мастацка-навуковым пераказе. Перш за ўсё пытанні радыкальнага працягу жыцця і дасягнення фізічнай неўміручасці, самаўдасканалення, кібаргазацыі, пераносу свядомасці, тэхналагічнай сінгулярнасці, нанатэхналогій, моцнага штучнага інтэлекту. Эсэ аўтара даюць зразумець, што чалавек ёсць прырода, таму разам з ім вымушана мяняцца ўсё наваколле. Чалавецтву заўсёды будзе мала. Так, замест Селіконавай даліны, як піша Юрась Барысевіч, з’яўляецца Селіконавы век, заселены “анонімусамі” – людзьмі, што ўвесь час знаходзяцца ў сеціве, людзьмі-сецівамі. Аўтар кажа, што толькі там мы станем адчуваць сябе моцнымі, адзінымі і запатрабаванымі.

Кніга была напісана ў 2002 годзе, але яна будзе касандраўскай і праз чатырнаццаць год. Аўтар канстатуе факты, задае пытанні, якія актуальныя і ў наш час. Зразумела, што адказ у кожнага павінен быць свой. Але Юрась Барысевіч засцерагае людзей ад магчымай інфернальнасці, г. зн. дэманізацыі тэхнікі, калі чалавечая рэінкарнацыя пачне адбывацца пры жыцці. Да чаго гэта прывядзе – не вядома, але “там дзе птушкі – там і самалёты” [1], – кажа пісьменнік.

**Літаратура**

1 Барысевіч, Ю. Alter Nemo [Электронны рэсурс] / Юрась Барысевіч. – Рэжым доступу: http://kamunikat.com/k_filazofija.html?pubid=12979. – Дата доступу: 21.04.2016 г.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ